Лінькова Н.А., студ. БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Прохарцава Т.А., выкладчык

# АРНАМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ НА КЕРАМІЧНЫХ ВЫРАБАХ ЖЛОБІНШЧЫНЫ З ЧАСОЎ НЕАЛІТУ ДА ЭПОХІ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Арнаменты на керамічных вырабах з'яўляюцца найбольш распаўсюджанымі сведчаннямі першабытнага мастацтва. Арнамент – гэта ўзор з рытмічна ўпарадкаваных элементаў для аздаблення твораў выяўленчага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інш. На Беларусі найбольш раннія формы арнамента выяўлены на рэчах эпохі верхняга палеаліту. У залежнасці ад выкарыстаных форм і матываў адрозніваюць геаметрычны, раслінны, зааморфны і антрапаморфны арнаменты. У шэрагу вырабаў арнаменту надаваўся сэнсавы, часам магічны характар, ён меў канкрэтны рэлігійна-міфалагічны змест [1, с. 44].

Пранікненне старажытнага чалавека на тэрыторыю Жлобінскага раёна адбывалася у канцы эпохі верхняга палеаліту. А ужо ў эпоху мезаліту ( IX - V тысячагоддзі да н.э.) тэрыторыя была абжыта плямёнамі днепра-дзяснінскай археалагічнай культуры [2, с. 22]. Гліняны посуд меў у асноўным слоікападобную форму, арнамент наносіўся зрэдку.

На змену эпохі мезаліту прыходзіць неаліт, які працягваўся на тэрыторыі раёна з канца V тысячагоддзя да н.э. да канца III тысячагоддзя да н.э. Галоўнымі рысамі, якія карэнным чынам адрозніваюць неаліт ад папярэдняга перыяду, з'яўляюцца вынаходніцтва глінянага посуду і паступовае распаўсюджванне вытвараючых форм гаспадаркі. Практычна ўвесь гліняны посуд эпохі неаліту быў арнаментаваны. Пад верхам гаршкі аздабляліся поясам глыбокіх круглых ямак або наколаў. Сценкі-бакавінкі ўпрыгожваліся адбіткамі грабеньчатых і пласцінчатых штампаў, наколамі, пракрэсленымі рысамі. Сустракаліся і іншыя элементы арнаменту. Крыху

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пазней большасць вырабаў пакрывалася разнастайнымі кампазіцыямі ад брыжа ажно да самага дна [5, с. 50].

Берагі Бярэзіны, Дняпра і іх прытокаў у гэты час засялялі плямёны днепра-данецкай археалагічнай культуры. Носьбіты ўсходне-палескага варыянта днепра-данецкай культуры, ускраінай якога з’яўляюцца неалетычныя паселішчы Жлобіншчыны, выраблялі ляпны посуд – шыракагорлыя адкрытыя вастрадонныя гаршкі вялікіх і сярэдніх памераў. Венчыкі посуду былі прамыя або крыху адагнутыя вонкі, падкрэсліваліся радам ямак. Тулава злёгку выпуклае. Верхнія часткі гаршкоў упрыгожаны арнаментам, элементамі якога з’яўляліся адбіткі грэбеня, насечкі, наколы і пракрэсленыя лініі. Элементы, у сваю чаргу, складаліся у матывы ў выглядзе гарызантальных і дыяганальных радоў, ёлачных узораў, касой сеткі, трохвугольнікаў, хвалістых і прамавугольных фігур [2, с. 23].

Пасудзіны, якімі карысталіся першыя засяліўшыя тэрыторыю сучаснай Жлобіншчыны носьбіты культуры шнуравой керамікі (сярэднедняпроўскай культуры), былі арнаментаваны сціпла. Аздабленне часта абмяжоўвалася некалькімі гарызантальнымі адбіткамі шнура, абкручанага па сырой гліне пад краем пасудзіны, або паскам кароткіх нарэзак ці насечак, размешчаных ялінкай. Часам гэтыя ўзоры акантоўваліся па ніжнім краі кароткімі насечкамі, размешчанымі вертыкальна ялінкай або лукаткай. У другой чвэрці II тысячагоддзя да н.э. посуд пачынае арнаментавацца багацей. І хоць узор у рэдкіх выпадках пакрывае усю паверхню сценак, аднак ён набывае шматзанальнасць і ўзбагачаецца новымі элементамі. У арнаментах пачынаюць дамінаваць наразныя лініі, гарызантальныя адбіткі шнура, якія іншы раз дзеляць узор на зоны. Шырока распаўсюджваюцца запоўненныя нарэзкамі трохкутнікі. Пастаўленныя пачаргова на вяршыні і асновы, яны запаўнялі цэлыя паясы. Знізу і зверху арнаментаванае поле, бывала, акантоўвалася паскамі з вертыкальных кароткіх насечак або нарэзак. Па-ранейшаму прысутнічае у арнаментах матыў ялінкі. У гэты час ужо

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сустракаюцца  і рамбічныя ўзоры, надзвычай падобныя на нашы сучасныя арнаменты.

У познім неаліце на пласкадонных пасудзінах найчасцей сустракаюцца ўзоры ялінкі і лукаткі, што пакрывалі вырабы ад брыжа і да самага дна. Пазней арнамент канцэнтруецца толькі на шыйцы гаршкоў.

Уяўляе цікавасць і кераміка з паселішча ва ўрочышчы Багданава гара каля в. Таўстыкі. Асноўнымі элементамі арнамента, якім упрыгожаны посуд, былі ўзаемаперакрыжаваныя расчосы і лапчастыя ўціскання, выкананыя канцом палачкі, абвітай вяровачкай. Прысутнічаюць таксама і адбіткі грэбеня, і наколы.

У сярэдзіне III тысячагоддзя да н.э. паселішчы ніжняй Бярэзіны і адпаведнага ўчастка Дняпра знаходзіліся пад уплывам  паўночных і усходніх суседзяў – носьбітаў верхнедняпроўскай археалагічнай культуры і ўваходзілі ў склад пагранічна-кантактнай зоны 2 археалагічных культур – днепра-данецкай і верхнедняпроўскай. Керамічныя вырабы гэтага часу арнаментаваны ў асноўным адбіткамі вяровачкі, шнура, лінейнага штампа і наразнымі лініямі.

У пачатку II тысячагодддзя да н.э. першабытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку Жлобіншчыны, уступіла ў бронзавы век. У гэты час пашыраецца керамічная вытворчасць. Вялікі посуд неаліту змяняе меншы па памерах, але больш разнастайны па форме і прызначэнню. Найбольш характэрная рыса гаршкоў – пласкадоннасць [2, с. 24 ]. Ускладняецца арнамент, посуд укрываюць шырокія паясы з трохкутнікаў, квадратаў, ромбаў, крыжыкаў, дужак, што чаргуецца з вузкімі паясамі з насечак і наколаў [3, с. 231]. Археалагічныя помнікі сярэднедняпроўскай культуры на тэрыторыі раёна прадстаўлены паселішчамі каля вёсак Праскурні, Малыя Рагі, Верхняя Алба, Саланое, Таўстыкі. Напрыклад, каля в. Таўстыкі былі знойдзены фрагменты посуду ранняй бронзы, упрыгожаныя гарызантальнымі радамі лінейнага штампа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У VII - III стагоддзя да н.э. тэрыторыю Жлобіншчыны займалі плямёны мілаградскай культуры. У канцы III – пач II ст да н.э. склалася зарубінецкая культура. Яна займала тэрыторыю, на якой раней жылі мілаградскія плямёны. На Жлобіншчыну прыпадае, магчыма, верхнедняпроўскі варыянт гэтай культуры.

У сярэдні бронзавы век у арнаментах на кераміцы з'яўляюцца баразёнчатыя элементы і адбіткі тонкага арнаменціра з абматаным вакол яго шнуркам або ніткай – ружанцавыя ўзоры [4, с. 51]. Арнаменты на сярэднебронзавых гаршках перамяшчаюцца ўверх.  Спрэс упрыгожаныя экземпляры сустракаліся пераважна толькі ў Падняпроўі ў зоне распаўсюджання сосніцкай археалагічнай культуры, якая прыйшлана змену сярэднедняпроўскай культуры у сярэдзіне II тысячагоддзя да н.э. (пераважна на тэрыторыі Жлобінскага і Рагачоўскага раёнаў). Практыкавалася многазанальнасць, у большасці выпадкаў гаршчок або міска аздабляліся на венцы гарызантальнымі баразенкамі або ружанцавымі адбіткамі, ніжэй якіх размяшчаліся звісаючыя ўніз трохкутнікі або лукаткі. На некаторых пасудзінах меўся шэраг глыбокіх ямак пад брыжам і былі грабеньчатыя адбіткі. Сустракаліся і шнуравыя арнаменты. Часам аздабленне гаршкоў дапаўнялі налепныя валікі. У канцы існавання сярэднебронзавых культур арнаменты бяднеюць. Нярэдка яны абмяжоўваюцца вузкай стужкай пад самым брыжам, сустракаюцца і зусім не арнаментаваныя вырабы і гэта тэндэнцыя яшчэ больш выразна праяўляецца ў познім бронзавым веку [4, с. 52].

Значны крок наперад зрабіла ганчарства ў часы Кіеўскай Русі. У X стагоддзі на заходнерускіх землях уваходзіць ва ўжытак ганчарны круг, што даў магчымасць наладзіць масавую вытворчасць бытавога посуду, аказаў значны ўплыў на мастацкі бок вырабаў і іх формы, якія набылі больш зграбны выгляд.

З узнікненнем гарадоў ганчарства набывае спецыялізаваны рамесніцкі характар, пра што сведчаць шматлікія знаходкі цэлых вырабаў і іх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фрагментаў з клеймамі, размешчаных на знешнім баку днішча. Ганчарнае рамяство дасягае свайго росквіту у XVI – XVII стагоддзі. На Жлобіншчыне буйным ганчарным цэнтрам стаў г. Стрэшын.

Што датычыцца арнаментальных матываў на сярэднявяковым посудзе Жлобіншчыны, то яны значна не адрозніваліся ад тых узораў, што існавалі ў папярэдні час: значная увага надавалася зігзага- і хвалепадобным непрырыўным лініям каля венца. Гэтыя ж матывы маглі быць зроблены рамбічнымі насечкамі на аднолькавай адлегласці адзін ад аднаго амаль па ўсяму вырабу.

У гэты час пашыраюцца зоаморфныя і раслінныя матывы. Ганчары пачынаюць упрыгожваць узорамі не толькі посуд, але і пячную кафлю (адзін з відаў архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі). У в.Лукі, напрыклад, былі знойдзены некалькі фрагментаў кафлі прыкладна XIV – XV стагоддзя, з выявай казы, вакол якой разнастайныя завіткі і стылізаваныя расліны. А каля в.Лугавая Вірня на левым беразе р.Ржаўка знойдзены фрагменты кафлі, на якіх пераважаюць стылізаваныя раслінныя матывы.

У Сярэднявеччы ўжо можна сустрэць і геаметрычныя узоры, выкананыя з дапамогай драўлянага штампіка. У в.Лугавая Вірня знойдзены фрагменты гаршкоў з выразным высокім венцам, якое была упрыгожана паралельным штампаваным арнаментам, а таксама штампаваная кафля.

Такім чынам, у формах вырабаў эпохі неаліту, бронзы і жалеза прасочваюцца асноўныя мадэлі посуду, якія ўстойліва захоўваюцца ў наступныя тысячагоддзі. Практычна да нашых дзён дайшлі і некаторыя віды арнаменту, напрыклад прадрапаны, хвалісты і г.д. Нязменнымі засталіся і асноўныя матывы (геаметрычныя і раслінныя, стылізаваныя фігуркі чалавека і жывёлы).

Спіс выкарыстанай літаратуры:

1. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл./Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў і інш. – Мн.: БелЭн, 1993

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Жлобіна і Жлобінскага раёна/ Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд) і інш.; Маст.Э.Э.Жакевіч. – Мн.:БелЭн, 2000

3. Беларусы: У 8 т. Т.1: Прамысловыя і рамесныя занякткі/Рэдкал.: В.К. Бандарчык, М.Ф. Пiлiпенка, В.С. Цiтоў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995.

4. Чарняўскі, М.М. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. – Мн.: Нар. асвета, 1981

5. Чарняўскі, М.М. Ілюстраваная гісторыя старажытнай Беларусі. – Мн.: Нар. асвета,1997

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ